Пролетавы ўсіх краёў, злучайцеся!

ГІДРА-МЭТЭОРОЛЁГІЧНЫ КАМІТЭТ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут. Тэл. 17-93

№ 5 (119) | 11—20 лютага | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

СЫНОПТЫЧНЫ АГЛЯД

Цёплае тропічнае паветра, якое ў канцы папярэдняй дэкады пранікла ў заходнія часткі эўропейскай тэрыторыі Саюзу, было хутка выціснута тылавымі полярна-марскімі масамі. У першы дзень гэтае дэкады паміж 30-ым і 35-ым мэрыдыянамі працягнуўся фронт оклюзыі з поўдня Саюзу да цэнтра цыклёну ў Барэнцавым моры.

На гэтым фронтальным падзеле 11-га ў межах Ленінградзкай вобласьці ўтвараецца хваляваньне, якое хутка патухае, прычым адзначаны падзел паміж полярна-марскімі і контынэнтальна-полярнымі масамі працягвае свой рух к усходу.

Праз дзень у тым-жа раёне хваляваньне паўтараецца на новым фронце, які ізноў падышоў з захаду; гэта дае пачатак цыклёнагэнэзу на эўропейскай тэрыторыі Саюзу.

Разьвіваецца абшырны цыклён, які жывіцца за кошт пранікаўня паасобных порцый марскога полярнага паветра. Утварэньне шэрагу фронтальных падзелаў і рух іх к усходу выклікае сьнегапады на абшарах эўропейскай тэрыторыі Саюза.

К канцу дэкады цыклён значна запаўняецца, ссоўваючыся к поўначы, а ў паўднёвай палове выяўляецца антыцыкленагэнэз.

Табліца вынікаў мэтэоролёгічных на[…]

Кліматычныя раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра																Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %
			11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Число, калі назг. min	
(Вазёрны)	2	Дрыса [1] . .	—3	—5	—1	—3	—5	—10	—10	—12	—9	—11	—	—7	—	2	—20	18	89
	3	Полацак [2] . .	—3	—4	—2	—3	—5	—8	—9	—13	—10	—11	—	—7	—7	1	—18	18	85
	68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж [3] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва [4] . . .	—4	—6	—4	—4	—6	—9	—9	—14	—10	—12	—	—8	—8	1	—20	18	78
(Радападзельны)	8	Лепель . .	—3	—5	—2	—3	—5	—8	—8	—12	—10	—12	—	—8	—	—1	—16	—	75
	15	Сянно [5] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр [6] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў [7] . .	—3	—5	—3	—2	—5	—7	—8	—11	—7	—8	—	—6	—6	3	—17	20	79
	16	Менск [8] . .	—3	—5	—2	—2	—6	—6	—7	—8	—6	—8	—	—5	—6	3	—14	18	79
	93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка [9]	—3	—5	—2	—3	—5	—5	—6	—7	—8	—9	—	—5	—6	—1	—	—	78
	25	Асіпавічы [10] .	—3	—5	—3	—2	—5	—5	—6	—6	—7	—8	—	—5	—6	1	—12	18	76
	10	Ворша [11] .	—3	—5	—4	—3	—5	—7	—7	—10	—9	—12	—	—6	—7	2	—17	20	80
	19	Горкі [12] . . .	—3	—6	—4	—3	—5	—7	—8	—11	—10	—13	—	—7	—7	0	—18	20	87
[illegible]	89	Клічаў [13] . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак [14] . .	—3	—5	—2	—3	—6	—5	—6	—8	—7	—10	—	—5	—	2	—16	18	—
	119	Ратміравічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў [15] .	—3	—5	—4	—3	—5	—8	—7	—10	—8	—11	—	—6	—7	1	—18	20	—
	73	Чавусы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў [16] .	—2	—5	—4	—2	—5	—9	—7	—10	—10	—10	—	—6	—7	2	—16	17	—
	71	Касьцюковічы [17]	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	32	Жлобін [18] . .	—1	—5	—3	—2	—5	—7	—6	—8	—12	—8	—	—6	—6	1	—15	19	91
[illegible]	33	Жыткавічы [19].	—2	—5	—2	—2	—4	—5	—6	—6	—10	—11	—	—5	—5	1	—16	20	88
	37	Калінкавічы [20].	—1	—5	—3	—1	—5	—6	—6	—7	—11	—8	—	—5	—5	1	—17	19	72
	39	Лельчыцы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск [7] .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба [21] . .	—2	—6	—4	—2	—4	—5	—6	—9	—12	—6	—	—6	—	0	—16	20	—
	38	Гомель [22] . .	—1	—5	—4	—1	—4	—7	—6	—7	—12	—7	—	—5	—6	3	—16	19	86
	35	Васілевічы [23] .	—1	—6	—3	—1	—4	—7	—6	—7	—12	—8	—	—5	—5	3	—17	19	67
	40	Людвінава [24] .	—1	—6	—4	—1	—4	—8	—7	—9	—12	—8	—	—6	—5	2	—18	19	70
	242	Красілаўка .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Гl: [1] туман (20), моцны вецер (18); [2] туман (17, 18, 20); [3] мяцель (15, 17), туман (20); [4] мя[…] (13,14, 15), туман (14, 18, 20); [9] моцны вецер (15); [10] мяцель (11, 13, 15), паземак (17), сьн. зан. (12); […] [13] мяцель і туман (11); [14] мяцель (12, 13, 15), туман (18); [15] мяцель (11, 15, 16, 17); [16] мяцель […] земак (15, 17); [20] мяцель (13, 14, 15, 17); [21] мяцель (11); [22] мяцель (11, 16), туман (11, 19); […]

...ных назіраньняў за 11—20 лютага 1933 г.

Чысло, калі на гл. міц.	Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпэратура паверхні глебы: Максым.	Мінімальн.	Чысло, калі на гл. міц.	Ападкі ў мм: 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	Сьнегавы насьціл: Вышыня ў см.	Шчыльнасць	Характарыстыкі сьнегавога насьцілу
18	89	—	—	—	1.0	0.1	1.0	6.0	1.0	1.0	0.3	0.2	..	0.1	—	10.7	19	0.21	роўнамер. без аг. лен. месц.
18	85	—	—	—	1.0	1.0	4.0	4.0	..	0.4	2.0	..	0.1	3.0	—	15.5	24	0.22	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	..	..	1.0	2.0	3.0	2.0	1.0	2.0	6.0	2.0	—	19.0	42	—	сумёты
18	78	—1	—22	18	..	..	3.0	1.0	14.0	..	4.0	..	..	3.0	—	25.0	46	0.22	роўн. без аг. мес
—	75	—	—	—	0.1	1.0	0.1	3.0	0.6	0.1	3.0	0.1	0.1	0.2	—	8.3	14	—	роўн. без аг. мес
—	—	—	—	—	1.0	0.6	1.0	1.0	4.0	2.0	4.0	..	0.3	2.0	—	15.9	32	—	"
—	—	—	—	—	2.0	1.0	1.0	2.0	0.4	2.0	0.1	0.1	0.5	1.0	—	10.1	25	—	няроўн. з аг. мес
—	—	—	—	—	2.0	3.0	12.0	4.0	2.0	1.0	1.0	3.0	0.5	6.2	—	28.7	33	—	роўн. без аг. мес
20	79	—	—	—	0.5	0.6	3.0	1.0	1.0	2.0	1.0	0.1	1.0	3.0	—	13.2	21	0.17	"
18	79	2	—15	18	0.5	1.0	2.0	3.0	0.6	..	0.5	0.1	2 0	1.0	—	10.7	25	0.22	"
—	—	—	—	—	0.3	1.0	4.0	1.0	0.1	3.0	0.2	1.0	3.0	2.0	—	15.6	22	—	"
—	78	—	—	—	1.0	..	0.5	3.0	1.0	..	3.0	0.1	0.2	0.5	—	9.3	24	—	"
18	76	—	—	—	..	2.0	3.0	0.1	0.6	3.0	1.0	..	2.0	0.5	—	12.2	20	0.26	"
20	80	—	—14	12	0.4	0.1	1.0	2.0	5.0	2.0	2.0	0.1	..	4.0	—	16.6	27	0.17	"
20	87	1	—22	19	..	1.0	3.0	5.0	3.0	0.5	2.0	0.3	..	0.2	—	15.0	30	0.22	сумёты
—	—	—	—	—	0.2	0.5	3.0	1 0	0.1	2.0	1.0	0.2	3.0	2.0	—	13.0	10	—	роўн. без аг. месц
18	—	—	—	—	0.3	1.0	2.0	1.0	0.1	2.0	2.0	0.5	2.0	..	—	10.9	10	0.24	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
20	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
17	—	—	—	—	0.3	0.2	3.0	13.0	5.0	1.0	1.0	0.1	1.0	3.0	—	27.6	36	—	роўн. без аг. месц сумёты
—	—	—	—	—	0.1	0.2	2.0	5.0	0.3	1.0	1.0	0.1	1.0	1.0	—	11.7	40	—	
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
19	91	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	30	—	роўн. без аг. месц
20	88	—	—	—	0.2	1.0	3.0	3.0	0.1	1.0	0.3	0.3	0.1	0.1	—	9.1	20	0.22	роўн. без аг. месц
19	72	—	—	—	0.1	0.1	2.0	8.0	0.1	0.4	0.2	0.3	0.1	2.0	—	13.3	29	0.16	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	0.2	0.2	4.0	9.0	2.0	1.0	2.0	..	1.0	2.0	—	21.4	38	—	роўн. без аг. месц
20	—	—	—	—	0.2	..	5.0	3.0	1.0	..	0.5	..	3.0	0.2	—	12.9	—	—	—
19	86	—	—	—	..	0.2	4.0	7.0	1.0	..	0.5	..	2.0	..	—	14.7	13	0.18	роўн. без аг. месц
19	67	—	—	—	0.4	0.4	3.0	11.0	1.0	1.0	1.0	..	1 0	..	—	18.8	32	0.25	"
19	70	3	—18	19	0.1	0.6	1.0	3.0	2.0	0.1	0.1	0.1	2.0	..	—	9.0	13	—	"
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

[4] мя... ...цель (11, 13, 20); [5] мяцель (13, 15); [6] мяцель (15); [7] мяцель (15, 17), туман (18); [8] мяцель
... (12); [11] мяцель (11, 13, 15), туман (18); [12] мяцель (11, 13, 16, 17, 19), ізмаразь і туман (18, 19);
...мяцель (11), туман (20); [17] мяцель (13, 14, 15, 16, 17, 19, 20), туман (20); [18] мяцель і туман (19); [19] па-
..., 19); [23] мяцель (20); [24] мяцель (11, 15).

Табліца вынікаў мэтэоролёгіч. назіраньняў за 11—20 лютага 1933г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер				Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме		Сярэдні стан паверхнёвага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
			Пераважаючы		З максым. хуткасьцю					
			Напрамак	Хуткасьць	Напрамак	Хуткасьць		Агульная	Ніжняя	
I Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	N	4	N	9	—	8	6	замерзш., заслан. сьнегам
	3	Полацак	W	4	NW	6	—	9	8	замерзш., заслан. сьнегам
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	7	Нова-Каралёва	S	4	NW	12	7	9	9	замерзш., цьвёрдая і сухая
II Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	NW	4	NW	6	—	10	>9	замерзш., заслан. сьнегам
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	„
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	„
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	„
	13	Барысаў	NW	4	NW	9	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	16	Менск	NW	4	NW	6	—	9	8	„
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	„
	23	Мар'іна-Горка	W	6	W	20	—	9	7	„
	25	Асіпавічы	SW	6	SW	9	—	10	9	„
	10	Ворша	W	2	NW	6	—	9	8	„
	19	Горкі	W	4	W	12	—	9	8	„
III Цэнтральны (Раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	28	Слуцак	W	4	NW	12	—	8	7	„
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	—	—	—	—	—	—	—	—
	21	Магілеў	W	4	NW	6	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	SW	4	NW	9	—	8	7	замерзш., заслан. сьнегам
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	„
	31	Турск	—	—	—	—	—	—	—	—
	32	Жлобін	W	—	W	20	—	9	8	замерзш., заслан. сьнегам
IV Паўночны (Нізіны)	33	Жыткавічы	W	4	NW	12	—	8	6	—
	37	Калінкавічы	W	4	W	9	—	9	8	замерзш., заслан. сьнегам
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	замерзш., заслан. сьнегам
	83	Барба	SW	4	S	9	—	9	9	замерзш., заслан. сьнегам
	38	Гомель	SW	4	SW	9	—	9	7	замерзш., заслан. сьнегам
	35	Васілевічы	SW	4	SW	9	10	8	7	„
	40	Людвінава	W	4	W	12	—	>9	9	—
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

Адпаведна адзначанаму разьвіцьцю цыклёнічнасьці, на абшарах эўропейскай тэрыторыі Саюза, разьмяшчэньне вобласьцяй высокага ціску на працягу дэкады ўяўлялася ў выглядзе паўкруга, які ўтваралі максымумы, над Ісьляндыяй, у заходняй Сібіры і над Арктыкай. Такое становішча спрыяла пахаладаньню як на захадзе эўропейскай тэрыторыі Саюза, так і ў заходняй Эўропе.

Стан надвор'я ў межах БССР на працягу дэкады адпавядае цыклёнічным умовам. Праз краіну штодзённа праходзяць фронтальныя падзелы, якія выклікаюць ападкі па ўсёй краіне. Выключэньнем зьяўляецца 16-е, калі падзел закрануў толькі крайнія паўночна-ўсходнія раёны, у выніку чаго амаль па ўсёй краіне колькасьць ападкаў была нязначнай.

З сярэдзіны дэкады ў краіну пранікаюць марскія арктычныя масы са Скандынавіі. Тэмпэратуры пачынаюць зьніжацца.

Больш рэзкае, але не паўсюднае зьніжэньне тэмпэратур адбываецца ў канцы дэкады ў выніку начных радыяцый.

Заходнія напрамкі вятроў, за выключэньнем апошніх двох дзён, адпавядаюць цыклёнічнаму руху паветра. Гэтыя напрамкі спыняюцца ў канцы дэкады ў сувязі з антыцыклёнагенэзам над басэйнам Акі і пераходзяць ва ўсходнія.

Л. Садоўскі.

Мэтэоролёгічная характарыстыка за 11—20 лютага 1933 г.

Тэмпэратура з пачатку дэкады трымалася досыць высокая: ад —1° да —4°, толькі ў 2-гі дзень наглядалася некаторае зьніжэньне да —5° і—6°. Але на 3-ці і 4-ты дзень яна ізноў падвысілася. З 15-га пачынаецца няўхільнае зьніжэньне т-ры, якое ў апошнія дні дасягнула на поўначы —14°, а на поўдні —12°. Толькі каля заходняй мяжы БССР на станцыях Барысаў-Менск-Асіповічы т-ра зьніжаецца ўсяго да —8° і —9°. На поўдні БССР у апошні дзень наглядаецца некаторае падвышэньне т-ры.

Сярэдняя дэкадняя т-ра вельмі блізка да нормальнай: або роўна ёй, або на 1° вышэй. Максымальныя т-ры былі вельмі высокія: да +3°. Мінімальныя т-ры даходзілі на поўначы да —20°, на поўдні да —18°, прычым наглядаліся на поўначы пераважна 18-га, на поўдні-ж 19-га і мясцамі 20-га.

Ападкаў на працягу дэкады выпала даволі значная колькасьць, у сярэднім па ўсёй БССР ад 10 да 20 мм. Па днёх дэкады яны разьмеркаваліся наступным чынам: у першыя два дні выпалі зусім нязначныя колькасьці, толькі мясцамі нязначна перавышаючыя 1 мм. 13-га наглядаліся больш значныя ападкі, да 4-5 мм. 14-га таксама, асабліва на поўдні, дзе ападкі далі да 10 і нават больш мм. У наступныя 3 дні выпалі значна меншыя колькасьці, якія рэдка дзе дасягалі 5 мм. 18-га ападкаў амаль зусім не наглядалася, за выключэньнем вельмі нязначных, менш 0,5 мм. і, нарэшце, у апошнія 2 дні ізноў паўсюды наглядаліся невялікія ападкі. Такім чынам, амаль кожны дзень на працягу дэкады адзначаўся выпадзеньнем ападкаў.

Сьнегавы насьціл, дзякуючы такому значнаму выпадзеньню сьнегу і ўстойлівай нізкай т-ры, павялічыўся з 15—20 см. папярэдняй дэкады да 25—40 см. Шчыльнасьць яго застаецца невялікай, каля 0.20. Заляганьне роўнамернае.

Вятры пераважалі заходнія з адхіленьнямі на поўнач і поўдзень. Сярэднія хуткасьці 4-6 м/сэк. Максымальныя хуткасьці дасягалі даволі значных вялічынь.

Воблачнасьць хісталася ад 80 да 100% агульнага пакрыцьця неба. У апошнія дні дэкады шмат дзе адзначаны туманы.

Амаль кожны дзень адзначаліся мяцеліцы, пераважна 11-га, 13-га, 15-га і 17-га.

Н. Малішэўская.

Мэтэаролёгічная характарыстыка лета 1932 г.

Лета на тэрыторыі БССР пачалося 15 мая і працягвалася да 12 верасьня. Такім чынам, працягласьць яго прыблізна 121 дзень. Нормальная-ж яго працягласьць ад 100 да 114 дзён. Адхіленьне ад нормы дасягае ў паўднёвай зоне 7—9 дзён, а ў астатняй частцы краіны каля 11—21 дню. Максымальнае адхіленьне дае паўночная зона. Такая значная працягласьць лета тлумачыцца раньнім наступленьнем яго і спазьненьнем восені.

Тэмпэратурны рэжым лета характарызуецца наступнымі паказчыкамі. Сярэднія месячныя тэмпэратуры даюць перавышэньне нормы ад 1° да 3°, ва ўсе месяцы, за выключэньнем чэрвеня, у які, наадварот наглядаецца нязначнае супроць нормы зьніжэньне тэмпэратуры.

Табл. 1

Сярэдняя месячная тэмпэратура паветра ў лета 1932 г.

Назва станцый	Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень	
	Сяр.	Адхіл. ад нормы	Сяр.	Адхіл. ад нормы	Сяр.	Адхіл. ад нормы	Сяр.	Адхіл. ад нормы
Новае-Каралёва .	14.3	+2.6	15.4	−0.3	19.8	+2.5	17.8	+2.5
Горкі	14.8	+2.3	16.4	−0.3	20.2	+2.2	18.4	+2.2
Менск	15.6	+3.1	15.8	−0.8	20.9	+2.9	18.1	+1.9
Турск	15.9	+2.5	17.0	−0.5	20.6	+1.7	18.5	+1.4
Жыткавічы . . .	17.1	+2.9	16.6	−1.2	21.2	+2.0	18.2	+0.9
Васілевічы . . .	16.4	+2.4	17.5	−0.1	20.8	+1.6	18.5	+1.3

Досыць высокія тэмпэратуры, якія ўстанавіліся ў першыя дні лета, павольна, але няўхільна ўздымаюцца да канца 3-й дэкады мая. Максымальная тэмпэратура мая прыпадае на апошнюю дэкаду і хістаецца паміж 27°—30°; мінімальная-ж тэмпэратура не наглядаецца ніжэй 5—8°, за выключэньнем паўночнай зоны, дзе мелі месца пасобныя выпадкі паніжэньня тэмпэратуры на паверхні глебы да 1,7° (Новае-Каралёва).

Пахаладаньне ў чэрвені зьявілася вынікам уваходжаньня на нашу тэрыторыю халодных полярных мас паветра, якія асабліва ўстойліва трымаліся на працягу першай дэкады. Але характэрна, як і ў маі, адсутнасьць прымаразкаў у паветры і на паверхні глебы. Гарачых дзён, г. зн. дзён з сярэдняй сутачнай тэмпэратурай звыш 20°, у гэтым месяцы параўнаўча мала, пераважае цёплае, дажджлівае надвор'е. Уздым тэмпэратуры, які ізноў наступіў ужо ў канцы чэрвеня, захоўваецца амаль на працягу ўсяго ліпеня і трымаецца аж да апошніх дзён першай дэкады жніўня. Максымальныя летнія тэмпэратуры дасягаюць 31-32° і наглядаюцца альбо ў канцы другой дэкады ліпеня, альбо ў пачатку 3-й дэкады жніўня. З 24 жніўня, дзякуючы ясным прахладным начом, сярэднія сутачныя тэмпэратуры даволі рэзка зьніжаюцца, але ў пачатку верасьня ізноў значна падвышаюцца. Табліца 2 ілюструе паўторнасьць сярэдніх сутачных тэмпэратур у летні сэзон. Усе дні лета разьбіты па наступных тэмпэратурных інтэрвалах: 1) дні з сярэдняй сутачнай тэмпэратурай —12°, 2) з тэмпэратурай 13°—19° і 3) з тэмпэратурай 20°.

Першая граніца абрана таму, што 13° зьяўляецца сярэдняй нормальнай тэмпэратурай лета, і дні з тэмпэратурай ніжэй 13° можна лічыць халоднымі, у другім інтэрвале зьмяшчаюцца дні, якія найбольш часта наглядаюцца ўлетку, дні-ж з сярэдняй сутачнай тэмпэратурай вышэй 20° можна лічыць выключна гарачымі.

Табл. 2.

Назва станцый	12°		13—19°		20°	
	Кольк. дзён	% %	Кольк. дзён	% %	Кольк. дзён	% %
Новае Каралёва . . .	17	14	71	59	33	27
Горкі	9	7	75	63	37	30
Менск	9	7	72	62	40	32
Васілевічы	3	3	68	55	50	42

Як відаць з гэтай табліцы, удзельная вага колькасьці дзён з сярэднімі сутачнымі тэмпэратурамі ў межах першай граніцы падае, а ў межах апошняй граніцы ўзрастае ў напрамку з поўначы на поўдзень.

Трэба адзначыць, што найвялікшая колькасьць дзён з тэмпэратурамі 20° прыпадае на ліпень месяц (Новае-Каралёва — 16 дз. і Васілевічы — 22 д.). Пры гэтым устойлівасьць высокіх тэмпэратур у паўднёвай зоне вызначаецца двума пэрыодамі па 10 дзён кожны, а ў астатняй частцы краіны пэрыодамі працягласьцю ад 3 да 8 дзён (Горкі). У жніўні колькасьць гарачых дзён (сяр. сут. т-ра 20°) зьніжаецца нават да 7-8 (Новае-Каралёва, Менск) з меншай устойлівасьцю.

Разьмеркаваньне ападкаў было наступнае:

Колькасьць ападкаў у маі і чэрвені значна перавысіла норму (амаль па ўсёй тэрыторыі БССР).

Табл. 3.

Ападкі (месячныя колькасьці) у лета 1932 г.

Назва станцый	Май		Чэрвень		Ліпень		Жнівень	
	Сума	Норма	Сума	Норма	Сума	Норма	Сума	Норма
Полацак	69.2	49	82.8	81	34.3	71	92.4	79
Новае-Каралёва	110.6	55	141.2	78	47.2	94	106.0	91
Менск	44.6	56	83.4	85	38.5	87	53.9	80
Мар'іна-Горка	—	—	101.0	75	28.7	92	50.2	77
Ворша	128.6	60	132.5	68	51.9	89	46.4	77
Горкі	142.6	50	142.7	74	108.7	84	79.6	82
Магілеў	78.5	57	125.5	80	24.9	83	64.0	79
Чэрыкаў	81.0	48	226.3	75	104.2	98	64.7	64
Васілевічы	135.6	60	71.6	78	66.5	99	56.4	70

З пачатку лета ў маі выпадаюць дажджы навальнічнага характару ў досыць вялікіх сутачных колькасьцях; часам наглядаюцца ліўні з градам.

На працягу чэрвеня дажджы наглядаюцца штодзённа, таксама пераважна навальнічнага характару. На крайнім усходзе БССР перавышэньне нормы дасягае 200% (выпала 226 мм.), галоўным чынам, за рахунак ліўняй, якія давалі сутачныя колькасьці да 40—60 мм. Толькі ў некаторых месцах паўднёвай і на захадзе паўночнай і пераходнай зон месячныя колькасьці ападкаў блізкія да нормальных. Сухое надвор'е наступае ў канцы чэрвеня і трымаецца на працягу першай дэкады ліпеня. Найбольш частымі ападкі былі ў апошняй дэкадзе ліпеня.

Наогул, месячныя масы ападкаў у ліпені у большасьці месц прыблізна ў 2-3 разы менш нормы (норма 70—100 мм.). Некаторае перавышэньне нормы мела месца на захадзе паўднёвай і ўсходзе цэнтральнай зоны.

Навальнічная дзейнасьць праяўляецца вельмі моцна ў другую палову ліпеня.

Выпадкаў граду ў гэтым месяцы амаль ня было.

У жніўні месячныя колькасьці ападкаў па большасьці тэрыторыі ад 20% да 40% ніжэй нормы. Толькі на поўначы ападкі ў жніўні перавысілі норму, а ва ўсходняй частцы цэнтральнай зоны ледзь роўны норме. Максымальныя сутачныя колькасьці выпалі ў другой палове першай дэкады і даходзілі да 30—40 мм.

Град у жніўні амаль нідзе, апроч рэдкіх выпадкаў у паўднёвай зоне, не адзначаецца.

Лік пахмурных дзён улетку знаходзіцца ў межах месячных норм, за выключэньнем чэрвеня, які характарызуецца падвышанай пахмурнасьцю, прыблізна на 35—50% вышэй нормы. Гэтаму адпавядаюць лічбы гадзін сонечнага зьзяньня (у %% ад магчымага) па месяцох, якія дадзены ў табл. 4.

Табл. 4.

Сонечнае зьзяньне ў %% ад магчымага ў лета 1932 г.

Назва станцый	Май (з 15-га па 31-га)	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень (з 1-га па 12-га)
Новае-Каралёва . . .	54	33	63	45	57
Зазер'е (каля Менску) .	58	35	64	55	54
Мар'іна-Сосны . . .	58	35	61	53	няма зьвест
Турск	63	38	63	57	63
Васілевічы	64	43	62	53	55

Пераважаюць вятры малых хуткасьцяй, паўночных і паўночна-заходніх напрамкаў.

У розных месцах краіны на працягу лета наглядаюцца туманы, але больш часта яны былі ў жніўні.

На падставе разгледжаных мэтэоролёгічных умоў лета 1932 г. можна характарызаваць, як падвышана-цёплае і досыць вільготнае, прычым асабліва вільготнай была першая палова лета да ліпеня месяца.

П. М. Фрумкіна.

Папярэднія вынікі конкурсу на лепшую рацпрапанову

1 сакавіка канчаецца тэрмін конкурсу, абвешчанаму групай рацыяналізацыі і вытворчым сэктарам МК Гімэін'у.

Ужо зараз можна падвесьці папярэднія вынікі гэтага конкурсу.

Усяго на конкурс за час з 1.I.33 г. на 20.II.33 г. паступіла 13 прапаноў, з іх ад работнікаў пэрыфэрыі—3 прапановы і ад работнікаў Гімэін'у 10 прапаноў.

Да конкурсу ў групу рацыяналізацыі паступіла з пэрыфэрыі 3 прапановы.

Такім чынам, на 20.II маецца 16 прапаноў.

Па зьместу паступіўшыя прапановы падзяляюцца наступным чынам:

а) конструкцыйныя—8.
б) організацыйныя—6.
в) іншыя—2.

Як відаць, колькасьць конструкцыйных прапаноў перавышае колькасьць іншых катэгорый.

Усяго прапановы паступілі ад 8 чал. Максымальная колькасьць прапаноў на аднаго чалавека—5 прапаноў.

З 16 паступіўшых прапаноў, 4 прапановы ўжо канчатkова разгледжаны і дзьве прыняты.

Астатнія 12 прапаноў знаходзяцца на разглядзе (на водгуку ў розных спэцыялістых) і на 7 з іх ужо маецца папярэдняя думка.

З двух прынятых прапаноў адна ўжо заканчваецца афармленьнем і ў бліжэйшы час будзе спушчана на месцы для правядзеньня ў жыцьцё. Па другой робяцца чарцяжы.

Такія нязначныя лічбы паступіўшых прапаноў гавораць аб той недаацэнцы значэньня конкурсу, якая маецца ў колах работнікаў Гідрамэтслужбы, аб тым, што яшчэ ня ўсе ўсьвядомілі сабе неабходнасьць падзяліцца сваім вопытам з другімі.

А што вопыт у нашых т.т. маецца, гэта бясспрэчна, таму што некаторыя з іх працуюць на гідрамэтэорсетціі па 10—15 гадоў. Ім неабходна падзяліцца гэтым вопытам з астатнімі, больш маладымі работнікамі. Гэта можна карысна зрабіць толькі праз групу рацыяналізацыі, а конкурс зьяўляецца аднэй з форм гэтага абмену вопытам.

Але вынікі паказваюць, што мэта конкурсу не дасягнута, калі з 500 працуючых у Гімэіне і на пэрыфэрыі чалавек у конкурсе прыняло ўдзел усяго 8.

Такім чынам, на сёнешні дзень можна лічыць конкурс амаль сарваным, ня гледзячы на шэраг мерапрыемстваў, праведзеных групаю рацыналізацыі для забесьпячэньня яго посьпеху.

Справе рацыяналізацыі нашае работы, справе асваеньня яе тэхнікі мы павінны аддаць максымальную ўвагу. Гэтую задачу ставіць перад намі партыя і ўрад.

І калі ў пачатку разгортваньня рацыяналізатарскай работы конкурс ня даў пасьпяховых вынікаў, мы ўсё-ж павінны спадзявацца, што ў далейшым на гэты бок работы будзе зьвернута нашымі работнікамі больш увагі, і справа рацыяналізацыі ў вобласьці гідромэтслужбы рушыць уперад.

Булаўка А.

Менск. Друк. БАН. Зак. № 4316. Гарліт № 1263. Тыраж 1000 экз. 10 стар.